# Педагог вышэйшай катэгорыі

Агульнапрызнаным майстрам сваёй справы з'яўляецца настаўніца матэматыкі Бахаnоўскай сярэдняй школы Тамара Паўлаўна Хадасевіч. Недарэмна яна атэставана, як педагог вышэйшай катэгорыі. Урокі яе сучасныя па форме і зместу. Праходзяць яны цікава і інтэнсіўна, з вялікай нагрузкай. Да кожнага навучэнца ў педагога дыферэнцыраваны падыход, а кожны ўрок не падобны на іншы.

Т. П. Хадасевіч творча падыходзіць да арганізацыі вучэбнага працэсу, правільна рэалізуе ў практыцы сваёй работы патрабаванні новых праграм, на высокім метадычным узроўні праводзіць кожныя заняткі.

Вопыт вясковай настаўніцы ў свой час быў абагульнены і распаўсюджаны па школах раёна метадычным кабінетам раённага аддзела народнай адукацыі.

І гэта не выпадкова, бо ва ўмовах карэннай перабудовы і шырокай дэмакратызацыі сучасная школа не можа працаваць без сапраўднай гуманізацыі. Вучань далучаецца да ведаў без прымусу, дабраахвотна. Таму многія навучэнцы ахвотна займаюцца ў матэматычным гуртку. Выпускнікі школы пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы звычайна паказваюць добрыя веды па матэматыцы. Нямала з іх і далейшы жыццёвы шлях выбралі сабе нялёгкі, пайшлі служыць на ніве асветы, сталі педагогамі-матэматыкамі. А цяпер з удзячнасцю ўспамінаюць сваю настаўніцу Тамару Паўлаўну.

Зараз Т. П. Хадасевіч рыхтуецца да справаздачы ў сваім педагагічным калектыве па пытанню «Актывізацыя разумовай дзейнасці навучэнцаў пры вывучэнні і замацаванні новага матэрыялу». І няма сумнення, што многім, а асабліва маладым, шмат чаму можна будзе павучыцца. Тамара Паўлаўна заўжды пакідае глыбокі след у свядомасці сваіх выхаванцаў. І іх удзячная памяць -- вышэйшая для яе ўзнагарода.

**М. КАЗАКОЎ.**

**Казакоў, М.** Педагог вышэйшай катэгорыі / М. Казакоў // Шлях Кастрычніка. — 1992. — 18 лютага. — С. 3.

*Вопыт настаўніцы Бахаnоўская сярэдняй школы Т.П. Хадасевіч.*